# ПАШПАРТ ДЛЯ КАЦЕЛЬНІ

## НЕ ТОЛЬКІ АЦЯПЛЕННЕ, АЛЕ І ДАХІ, СТЫКІ, БАЛКОНЫ

Як адзначыў **намеснік генеральнага дырэктара — галоўны інжынер ДП «Мінсккамунцепласетка» Генадзь ЛУКАШЭВІЧ**, праведзена падрыхтоўка да работы ў новым ацяпляльным сезоне, у тым ліку адпаведныя прафілактычныя рамонты абсталявання кацельных і цеплавых пунктаў, а таксама неабходныя прафілактычныя работы па цеплавых сетках, гідраўлічных выпрабаваннях, іншыя работы. У выніку да 20 жніўня атрыманы пашпарты гатоўнасці. Дарэчы, выпадкаў зрыву тэрмінаў падрыхтоўкі да зімы ў Мінску не было.

— Работы праведзены якасна і ў тэрмін. Аб'екты, якія знаходзяцца на балансе прадпрыемства «Мінсккамунцепласетка», гатовы да ацяпляльнага сезона. Дыспетчарскія і аварыйна-рамонтныя брыгады ўкамплектаваны персаналам, неабходнымі матэрыяламі, праведзена адпаведная работа па падрыхтоўцы спецыялістаў: інструктажы, супрацьаварыйныя трэніроўкі. Створаны неабходны запас рэзервовага паліва. Прадпрыемства гатова да ацяпляльнага сезона, — падкрэсліў Генадзь Лукашэвіч.

Прадпрыемствы дзяржаўнага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» (а іх 66, у тым ліку дзевяць КУП ЖКГ раёнаў Мінска, восем ЖРЭА, 38 ЖЭУ) таксама правялі неабходную падрыхтоўку. А на тэхнічным абслугоўванні аб'яднання, між іншым, знаходзіцца 6438 дамоў агульнай плошчай 34,7 мільёна кв. м.

— Мінулы ацяпляльны перыяд паказаў, што праведзеныя ў міжацяпляльны перыяд мерапрыемствы дазволілі не дапусціць збояў у рабоце цеплазабеспячэння і энергазабеспячэння жыллёвага фонду. Падача цяпла ў жылыя дамы адбываецца своечасова і ў адпаведнасці з патрабаваннямі сацыяльнага стандарту, — адзначае **намеснік генеральнага дырэктара па эксплуатацыі жылфонду і вытворчых пытаннях ДА «Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі» Рыгор КАЗУНКО**.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



Аб'ёмы работ па падрыхтоўцы жыллёвага фонду да работы ў асенне-зімовы перыяд былі зацверджаны вясной. А летам выкананы ўсе запланаваныя мерапрыемствы, у прыватнасці прафілактычны рамонт сістэм ацяплення, электраабсталявання, унутраных сістэм водазабеспячэння, прамыўка сістэм ацяплення ў жылых дамах. Акрамя таго, у міжацяпляльны перыяд адрамантаваны воданагравальнікі, цыркуляцыйныя помпы і цеплаізаляцыя. У стадыі завяршэння работы па рамонце канструктыўных элементаў жылых дамоў: дахаў, стыкаў, балконаў, сістэм водаадвядзення, уцяпленне канструкцый агароджвання.

— Да 20 жніўня жыллёва-камунальныя гаспадаркі атрымалі 100 % пашпартоў гатоўнасці. На сёння ўсе жылыя дамы гатовы да падачы цяпла. Эксплуатацыйнымі арганізацыямі Мінска згодна з графікамі вядзецца работа па запаўненні хімічна ачышчанай вадой унутрыдамавых сістэм цеплазабеспячэння. Завершацца гэтыя работы 13 верасня, — паведаміў Рыгор Казунко.

Летам у сталіцы сапраўды былі праведзены маштабныя работы па падрыхтоўцы да асенне-зімовага сезона. Сістэмы цэнтральнага ацяплення адрамантаваны і апрэсаваны ў 6324 жылых дамах, выканана гідрапнеўмапрамыўка 1723 сістэм ацяплення, што складае 100 %. Адрамантавана 234 воданагравальнікі, 285 цыркуляцыйных і павышальных помпаў, электраабсталяванне ў 6438 жылых дамах, 568 кубічных метраў цеплаізаляцыі.

Адноўлена 372,8 тыс. кв. м дахаў, аднак паколькі сёлетні план складае 415,8 тыс. кв. м, работы працягваюцца. Выпраўлена 221,5 тыс. пагонных метраў стыкаў паміж плітамі перакрыцця, уцеплена 31,9 тыс. кв. м. канструкцый агароджвання, выканаваны рамонт 4363 балконаў пры плане 4766 (92 %) і шкленне 10,6 тыс. кв. м месцаў агульнага карыстання.

На тэхнічным абслугоўванні Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі знаходзіцца 527 жылых дамоў (9520 кватэр) з газавым абсталяваннем, газавымі воданагравальнікамі, катламі. У такіх дамах у летні перыяд ачышчана 9860 дымавых, 19 528 вентыляцыйных каналаў, адрамантавана 12 дымавых і 25 вентыляцыйных каналаў.

— Пры падрыхтоўцы да зімовага перыяду Дзяржэнергагазнагляд правёў неабходныя праверкі, мы цалкам падрыхтаваны да запуску ацяплення, — падкрэсліў Рыгор Казунко.

Дарэчы, падчас сёлетняга ацяпляльнага сезона прыярытэтным відам паліва будзе газ, каля 11 % зоймуць мясцовыя віды паліва, 2 % — электраэнергія.

## НА ШТО СКАРДЗЯЦЦА МІНЧАНЕ?

Што датычыцца ацяпляльнага сезона, то летась асноўная частка заявак па лініі 115 паступала наконт нізкай тэмпературы ў кватэры. Па сацыяльных стандартах яна павінна падтрымлівацца ў дыяпазоне ад 18 да 24 градусаў. Паводле слоў Рыгора Казунко, ні адзін факт, што тэмпература ў кватэры была ніжэйшай за азначаныя лічбы, не знайшоў пацвярджэння.

Спецыяліст звярнуў увагу, што цяпер у Мінску выкарыстоўваюцца сістэмы аўтаматычнага рэгулявання, калі ацяпленне працуе ў залежнасці ад паказчыкаў датчыка тэмпературы на вуліцы.

— Калі яна больш за 8 градусаў, аўтаматычная сістэма ацяплення пераходзіць у рэжым праграявання. Людзі заўважаюць, што батарэя летняя, думаюць, што ацяпленне выключылася, і звяртаюцца. Эксплуатацыйныя арганізацыі праводзяць замеры тэмпературы — у кватэрах, як правіла, не менш за 20-22 градусы, — прывёў прыклад Рыгор Казунко.

Паступаюць скаргі і на тое, што ў суседнім доме значна цяплей. Жыллёва-камунальная служба рэагуе на кожны зварот: спецыялісты выходзяць да заяўніка і замяраюць тэмпературу. Як правіла, такія факты не пацвярджаюцца. Хоць часам здараецца і выветрыванне швоў паміж плітамі перакрыцця, пры ўстойлівых адмоўных тэмпературах ніжэй за 5 градусаў можа назірацца прамярзанне сцен. У такім выпадку дамы трапляюць у план на рамонт стыкаў, уцяпленне канструкцый абгароджвання.

**Алена КРАВЕЦ.**

Надвор'е

# ЧАЦВЁРТЫ МЕСЯЦ ЛЕТА?

**У пачатку верасня захаваецца летняе надвор'е. Пра гэта паведамляюць спецыялісты ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



У прыватнасці, сіноптыкі адзначаюць, што жнівень завяршыў летні сезон на высокай тэмпературнай ноце. На гэтым тыдні верасня сярэдняя тэмпература паветра па-ранейшаму будзе перавышаць кліматычную норму на 3—8 градусаў, у краіне захаваецца дэфіцыт ападкаў. У сувязі з гарачым і сухім надвор'ем узрастае пагроза лясных пажараў.

Тэмпература паветра ў аўторак будзе зашкальваць, асабліва ў цёмны час сутак. Нават у верасні бываюць трапічныя ночы, калі тэмпература паветра астуджаецца толькі намінальна, у нашым выпадку — да 12—18 градусаў. Днём усталюецца амаль ліпеньскае надвор'е — плюс 26—31 градус.

У сераду тэмпература паветра ўначы стане прахладней — 10—16 градусаў, удзень — 24—31 градус. У чацвер начная тэмпература панізіцца да 9—16 градусаў вышэй за нуль, аднак днём будзе прыпякаць — 23—30 градусаў.

У канцы першага восеньскага тыдня спякота злёгку адпусціць, але захаваецца ўмеранае летняе цяпло. У пятніцу тэмпература паветра ўначы складзе 10—16 градусаў, па паўночным усходзе — 8—9 градусаў. Днём будзе 22—29 градусаў.

У выхадныя стане яшчэ на некалькі градусаў ніжэй. У суботу тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 7 па паўночным усходзе да 15 градусаў па захадзе, днём — 22—28 цяпла. У нядзелю ўдзень чакаецца 20—27, ноччу 7—14 градусаў цяпла.

Асобна сіноптыкі адзначылі, што з 3 да 8 верасня будзе пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай з 4 да 8 верасня ў асобных раёнах чакаецца слабы туман.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Партыя прэзідэнта Азербайджана атрымала большасць месцаў у парламенце



Кіруючая партыя Азербайджана, якую ўзначальвае прэзідэнт Ільхам Аліеў, — «Ені Азербайджан» («Новы Азербайджан»), атрымала 68 са 125 месцаў у Мілі меджлісе (аднапалатным парламенце) рэспублікі па выніках пазачарговых выбараў, якія адбыліся 1 верасня. Паводле даных ЦВК па выніках апрацоўкі ўсіх пратаколаў з выбарчых участкаў, паведаміла ТАСС. 10 апазіцыйных партый атрымліваюць увогуле 11 месцаў. У парламенце папярэдняга склікання было прадстаўлена восем партый ад апазіцыі. Яшчэ 46 месцаў атрымалі кандыдаты, якія вылучаліся як незалежныя. На 125 месцаў у парламенце прэтэндавалі 990 кандыдатаў, 305 з іх — ад палітычных партый, астатнія — незалежныя.

## У Партугаліі заявілі аб глыбокім палітычным крызісе ў Еўропе



Прэзідэнт Партугаліі Марселу Рэбелу дзі Соўза заявіў, што палітычныя сістэмы еўрапейскіх краін знаходзяцца ў глыбокім крызісе, выкліканым іх няздольнасцю адаптавацца да сучасных глабальных рэалій. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на інфармацыйнае агенцтва Lusa. Па яго меркаванні, сістэмы, створаныя ў пасляваенныя гады і адаптаваныя да пераходу ад XX да XXI стагоддзя, састарэлі і знаходзяцца ў крызісе, паколькі не паспелі прыстасавацца да лічбавізацыі, змяненняў у энергетыцы, навукова-тэхнічнага прагрэсу і чаканняў моладзі. Марселу Рэбелу дзі Соўза лічыць, што «свет ужо не будзе ранейшым» незалежна ад вынікаў прэзідэнцкіх выбараў у ЗША. Сярод фактараў глабальных змяненняў ён згадаў эканамічнае аднаўленне Кітая пасля пандэміі каранавірусу, геапалітычнае становішча Расіі і «ўзыходзячых дзяржаў», такіх як ПАР, Бразілія, Індыя і Турцыя. Прэзідэнт Партугаліі прызнаў, што Еўропа «страціла імпульс» і цяпер «адстае» на сусветнай арэне.

## У Емене падчас паводак загінулі звыш 150 чалавек



Працяглыя залевы сталі прычынай утварэння наймагутнейшых паводак, якія ахапілі некалькі правінцый Емена. У выніку стыхіі больш за 150 чалавек загінулі, яшчэ тысячы жыхароў вымушаны пакінуць свае дамы. Пра гэта паведамілі еменскія крыніцы і ўпраўленне вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў, паведаміла ТАСС. Каля 40 чалавек загінулі ў паўночна-заходняй правінцыі Эль-Махвіт у выніку прарыву дамбы. Між тым упраўленне па справах бежанцаў паведаміла, што паводкі, якія пачаліся яшчэ ў сярэдзіне ліпеня, закранулі некалькі рэгіёнаў Емена, прычым найбольш пацярпелі заходнія і паўночна-заходнія правінцыі. Толькі ў правінцыі Эль-Махвіт пацярпела больш за 56 тысяч дамоў, і звыш тысячы сем'яў былі вымушаны пакінуць свае дамы. Разбуральная паводка таксама нанесла вялізную шкоду жыццёва важнай інфраструктуры, затапіўшы шырокія ўчасткі сельскагаспадарчых палеткаў і перакрыўшы ўчасткі дарог.